І.М.Грамовіч, *дацэнт*

# ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ САМАСТОЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ДА РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ ГУРТАМ

Методыка работы з фальклорным гуртам патрабуе разнастайных формаў і прыёмаў хормайстарскай працы. Паколькі ў аснове гуртавых спеваў ляжыць правільная вакальна-тэхнічная культура выканання, праца над песеннымі навыкамі і ўменнямі з'яўляецца тым асноўным напрамкам, вакол якога грунтуюцца ўсе астатнія элементы вучэбна-харавой працы. Педагагічныя задачы кіраўніка фальклорнага гурту вельмі падобныя на педагагічную працу выкладчыка па пастаноўцы голасу і дырыжыравання, але ўскладняюцца тым, што хормайстар мае справу з калектывам спевакоў. Каб

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

навучыць спяваць іншых, неабходна самому валодаць песенным голасам, ведаць сакрэты народнапесеннага выканання, удасканальваць сваё майстэрства, у любы момант умець паказаць голасам той ці іншы штрых, нюанс, галасавы прыём і інш. Разам з тым хармайстар павінен граматна растлумачыць патрабаванні, звязаныя з інтэрпрэтацыяй таго ці іншага народнага твора.

На сённяшні дзень вучэбны працэс пабудаваны такім чынам, што прадугледжвае комплекснае навучанне па пастаноўцы голасу, дырыжыраванні (практычны курс), засваенне тэарэтычнага курса па хоразнаўстве, авалодванне методыкай работы з фальклорным гуртам. Выкладчык імкнецца дапамагчы студэнтам набыць канкрэтныя навыкі і ўменні, навучыць іх новым прыёмам і, вядома ж, выхаваць пэўныя адносіны да навучання.

Абапіраючыся на шматгадовую педагагічную практыку, аналізуючы адказы студэнтаў на экзаменах і іх практычную работу з гуртам, мы зрабілі выснову, што авалодванне прафесіяй не можа адбывацца толькі ў класе выкладчыка. Такія заняткі іншы раз пераўтвараюцца ў вымуштроўванне дзеля паспяховай здачы экзаменаў. Неасэнсаванае вывучэнне музычнага матэрыялу і тэксту па пастаноўцы голасу вядзе да таго, што ў працы з народным хорам ці фальклорным гуртам студэнт становіцца бездапаможным. Гэта сведчыць аб тым, што навучэнцы не ўмеюць правільна і рацыянальна рыхтавацца да заняткаў. Самастойны падыход да партытуры народнага твора ў іх амаль поўнасцю адсутнічае. Самастойная праца студэнтаў над партытурай, над пастаноўкай голасу прадугледжана вучэбнымі праграмамі, але, як гэта павінна ажыццяўляцца на практыцы, не тлумачыцца ў метадычных матэрыялах.

Некаторыя выкладчыкі недаацэньваюць значэнне самастойнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Гэта засведчылі такія вядомыя вучоныя, як Д.Еўтушэнка і М.Міхайлаў-Сідараў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Яны лічаць, што студэнты, якія займаюцца без кантролю, могуць зрабіць не тое і тым самым нашкодзіць навучанню. Небяспека, вядома ж, тут ёсць, але тады, калі працэс самастойнай падрыхтоўкі мае стыхійны характар. На думку А.Г.Менабені, выкладчыку неабходна растлумачыць, як трэба выконваць дамашняе заданне, на што звярнуць большую ўвагу, а таксама вызначыць канкрэтныя патрабаванні да задання. Указанні павінны быць зразумелымі па сэнсе і выразнымі па фармуліроўцы. У асобных выпадках славеснае тлумачэнне можа быць аб'яднана з паказам.

Самастойная работа ажыццяўляецца па-за ўрокам, але роля выкладчыка ў навучанні пры гэтым не зніжаецца, а, наадварот, становіцца больш складанай і адказнай. Як від вучэбнай дзейнасці, самастойная работа студэнта патрабуе ад выкладчыка асобага педагагічнага падыходу, умення яе арганізацыі. Выкладчык ажыццяўляе індывідуальны падыход, прынцып паслядоўнасці ў навучанні, улічваючы здольнасці студэнта. Заняткі ён будуе такім чынам, каб паралельна праверыць і дамашняе заданне.

Педагагічны аспект самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў прадугледжвае выкарыстанне асноўных прынцыпаў дыдактыкі, такіх як нагляднасць, даступнасць і сістэматычнасць у навучанні, трываласць засваення ведаў і інш. Самастойная работа студэнта павінна разглядацца ў кантэксце развіцця яго творчай актыўнасці, самастойнасці мыслення, эмацыянальных і валявых працэсаў.

Для пачынаючага хормайстра здольнасць знаходзіць узаемасувязь выразных сродкаў музыкі, абагульняць, даваць аргументаваную ацэнку таму ці іншаму харавому твору з'яўляецца вельмі каштоўнай. У адпаведнасці з пастаўленай мэтай выкладчык накіроўвае самастойную работу студэнта на развіццё яго інтэлектуальных здольнасцей, высокую слыхавую

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

актыўнасць, хуткую рэакцыю на недакладную інтанацыю, няправільнае гукавядзенне, адсутнасць ансамбля і інш.

На першым этапе самастойная работа студэнта носіць падрыхтоўчы характар. Разам з выкладчыкам у класе разбіраецца песенны твор, вызначаюцца яго жанравая прыналежнасць, складаныя месцы ў партытуры і шляхі іх пераадолення. Студэнт сам рыхтуе звесткі аб кампазітары, фактуры выкладання, вывучае галасы, іграе партытуру.

Узровень спасціжэння твора значна павышаецца на другім этапе. А.Г.Менабені прапануе яго называць трэніровачным. Але больш дакладна, на наш погляд, гэты этап вызначыць як варыятыўны. Студэнт на дадзеным этапе павінен самастойна разабраць і вывучыць прапанаваны твор, кантралюючы сябе. Апошні этап набывае творча-самастойны характар. На гэтай ступені навучання будучы спецыяліст можа рэалізаваць сваю асабістую творчую задуму, праявіць свае веды па дырыжыраванні, пастаноўцы голасу, а таксама паказаць сваю музыкальнасць і зрабіць цікавую інтэрпрэтацыю выбранай народнай песні.

Безумоўна, выхаванне творчай актыўнасці — задача складаная і залежыць ад правільна пабудаваных заняткаў у класе, разнастайнасці формаў работы, ад ступені падрыхтаванасці студэнта, яго здольнасцей, самастойнай сістэматычнай работы.

У сваёй кнізе "Аб выхаванні дырыжора" І.А.Мусін прапануе метады дамашніх заняткаў маладога дырыжора. Перш за ўсё гэта метад раздзельнага засваення партытуры і метад супастаўлення. У практычнай рабоце з гуртам ужыванне метаду раздзельнага засваення партытуры вымушае студэнта чуць усе галасы партытуры, усе элементы фактуры выкладання. Разам з тым гэта дапамагае больш глыбока вызначыць выразныя якасці кожнай галасавой партыі, каб потым патрабаваць ад удзельнікаў гурту патрэбнай, якаснай палітры гукавядзення.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Рыхтуючыся самастойна дома, студэнт, вывучаючы галасавыя партыі, развівае ўменне адчуваць функцыянальныя сувязі паміж галасамі і ўвогуле ўдасканальвае здольнасць кантраляваць выкананне ўсяго твора.

Што датычыцца метаду супастаўлення, то гэты метад развівае ўважлівасць, уменне аналізаваць сваю работу і спевы гурту. Хормайстар удасканальвае слыхавую увагу, выканальніцтвае майстэрства, рухальныя адчуванні, адчуванне метрарытму, уменне раскрыць змест твора.

Рыхтуючыся да працы з гуртам, вызначаюцца мэта заняткаў, аб'ём работы студэнта. Выкладчык кантралюе дзеянні студэнта, дапамагае ў пошуках выканальніцкага рашэння твора і больш глыбокага спасціжэння сэнсавага значэння дынамікі, фразіроўкі, голасавядзення, голасаўтварэння і інш.

Рэакцыя будучага спецыяліста можа праяўляцца ў розных формах. Яна можа быць абыякавай, бяздумнага капіравання і ўзвышана эмацыянальнай. Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца актыўнае ўспрыманне заўваг і далейшае самастойнае выпраўленне памылак. Правільнае спалучэнне патрабаванняў выкладчыка да работы студэнта з асэнсаваннем апошнім значэння гэтых патрабаванняў забяспечвае станоўчы вынік навучальнага працэсу.

Такім чынам, наш пункт гледжання на педагагічную праблему самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў патрабуе спалучэння вучэбных і выхаваўчых задач, адзінства вучэбна-выхаваўчага і творчага працэсаў, аб'яднання тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў і ўменняў. Мы цалкам згодныя з наступнай думкай Г.Г.Нейгаўза: “Калі вучань не валодае эмацыянальнай спагадлівасцю, то неабходна дапамагчы яму розумам спасцігнуць тое, што пачуццю не дадзена”.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ